Источник: "Краязнаўчая газета" - 2015-02-26



# Сваю ведаць, чужую шанаваць

● **19 лютага** ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы быў зладжаны **традыцыйны музейны праект «У дыялогу культур»,** прысвечаны Міжнароднаму дню роднай мовы. Гэты дзень быў абвешчаны Генеральнай канферэнцыяй ЮНЕСКА 17 лістапада 1999 г. дзеля садзейнічання захаванню моўнай і культурнай разнастайнасці і шматмоўя, штогод адзначаецца 21 лютага. Дзяржавы-члены ЮНЕСКА выконваюць важную ролю ў падтрымцы родных моваў праз свае нацыянальныя ўстановы і арганізацыі дзеля збліжэння культур.

Акцыя «У дыялогу культур» стала ў музеі традыцыйнай. Янка Купала далучыў беларускую культуру да сусветнай, дзякуючы яго творчасці беларускую літаратуру ведаюць у многіх краінах. Запрошаныя госці – прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, акрэдытаванага ў Рэспубліцы Беларусь, – прачыталі вершы сваіх нацыянальных паэтаў на родных мовах.

● **19 лютага** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылося **мерапрыемства «У аснове ўсюды – слова»,** падрыхтаванае пры ўдзеле Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры і прымеркаванае да Дня роднай мовы. Да імпрэзы супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі тэматычную выстаўку.

Мова – гэта тое, без чаго не можа жыць ніводны чалавек. Родная мова ўваходзіць у наша жыццё з вуснаў маці. Прыгожае гучанне роднага слова мы пачынаем успрымаць з матчыных песень, цудоўных беларускіх казак, легендаў, паданняў, а таксама з твораў беларускіх пісьменнікаў.

● **20 лютага** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылася **літаратурная імпрэза «Аб мове роднай замоўлю слова я...»,** прысвечаная Міжнароднаму дню роднай мовы.

Народны паэт Беларусі Якуб Колас у свой час пісаў: «Роднае слова – гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет. Па-гэтаму нам неабходна так старанна вывучаць сваю родную мову, ведаць і любіць творы беларускай літаратуры».

Да імпрэзы была створаная выстаўка сумесна з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, з фондаў якога былі прадстаўленыя рукапісы беларускіх пісьменнікаў – сучаснікаў Коласа: Петруся Броўкі, Міхася Лынькова, Максіма Танка і інш., іх асабістыя рэчы. З фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа ўвазе наведнікаў былі прапанаваныя рукапісы вершаваных твораў і навуковых працаў Коласа, дакументы аб дзейнасці ў галіне айчыннага мовазнаўства Інбелкульта і Беларускай акадэміі навук.

*Паводле інфармацыі арганізатараў*

"Краязнаўчая газета". Міжнародны дзень роднай мовы